БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 28 (75)
кастрычнік
2008 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца
з мая 2006 г.

KAMUNIKAT.org

З Юбілеем! З Днём нараджэння!

10 кастрычніка
Таццяна Іванаўна
РАМАШКЕВІЧ
адзначае 75-годдзе

16 кастрычніка
Валянцін Мяфодавіч
БУРАЕЎ
адзначае 55-годдзе

25 кастрычніка
Уладзімір Сцяпанавіч
МАЙСЦЕР
адзначае 55-годдзе

2 кастрычніка
Вольга Мікалаеўна
ПАЛТАЎЦАВА
адзначае 25-годдзе

У кастрычніку нарадзіліся:

6 - Таццяна Міхайлаўна Васюрэнка
8 - Надзея Іванаўна Рамашкевіч
10 - Мікалай Іосіфавіч Калістратаў
13 - Валянціна Макараўна Мяшкова
14 - Алена Іванаўна Мухортава
15 - Міхаіл Аляксандравіч Маісеенка
16 - Тамара Трафімаўна Жураўкова
16 - Святлана Мікалаеўна Цеплякова
16 - Аляксандр Валер’евіч Бураеў
18 - Ганна Іпалітаўна Букатнёва
23 - Надзея Стэфанаўна Юрасава
23 - Максім Сяргеевіч Шастакоў
24 - Анатоль Ягоравіч Жылінскі
25 - Алена Сяргееўна Рамашкевіч
26 - Сяргей Пятровіч Парфененка
29 - Ганна Алегаўна Гулакова
30 - Міхаіл Анатольевіч Жылінскі
30 - Іван Іванавіч Сідараў

1 кастрычніка - Дзень пажылога чалавека.

Віншуем і жадаем здароўя, шчасця, дабрабыту!

Новае прызначэнне

1 кастрычніка 2008 г. на пасаду майстара Брылеўскага ўчастка МУКП “Жылкамгас” заступіў Аляксандр Мікалаевіч СІЛКОЎ.

Віншуем!

5 кастрычніка - Дзень настаўніка.

ВІНШУЕМ!

Новыя задачы

29 кастрычніка 2008 г. адбылося чарговае паседжанне выканкама Брылеўскага сельскага Савета. Галоўнае пытанне павесткі дня -- аб стане культурнага абслугоўвання насельніцтва.

Дырэктар Брылеўскага сельскага Дома культуры Мікалай Адамавіч Яцкоў паведаміў, што ўся культурна-асветная работа сярод вяскоўцаў будуецца згодна распрацаваным дзяржаўным праграмам. У Доме культуры працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці, дзе займаюцца ўсе жадаючыя. Выступленні творчых калектываў, такіх як, напрыклад, ансамбль "Любава", адбываюцца не толькі на нашай сцэне, але і на розных конкурсах, якія ладзяцца краўніцтвам аграфірмы "Днепр", і амаль заўжды нашы артысты атрымліваюць прызавыя месцы.

У.І.Мажораў

Н.А.Ярмаш і А.У.Аляксейкова

Н.І.Рамашкевіч

А.М.Яцкова

Вялікая ўвага надаецца сумеснай рабоце Дома культуры з бібліятэкай і школай. Таксама па пытаннях прававога выхавання работа вядзецца разам з прадстаўнікамі раённага аддзела ўнутраных спраў. Вялікая ўвага надаецца таксама працы над бюлетэнем "Брылеўскі летапіс", бо гэта адна з дзейсных форм культурна-асветнай работы.

Ёсць пэўныя недахопы і недапрацоўкі ў дзейнасці установы культуры, але агульнымі намаганнямі работа тут узнімецца на новы, больш высокі ўзровень.

Свае меркаванні выказалі прысутныя. З вялікай прамовай выступіла старшыня селькама в.Брылі Тамара Васільеўна Максімчыкава, якая шчыра і адкрыта выказала крытычныя заўвагі адносна працы Дома культуры. З некаторымі момантамі гэтай прамовы прысутным было цяжка згадзіцца, але кожны чалавек у нашай краіне мае права на свабоднае выказванне сваіх думак і меркаванняў.

Дырэктар Брылеўскай школы-сад Наталля Анатольеўна Ярмаш падкрэсліла, што і ў школы, і ў Дома культуры заўсёды агульныя намаганні ў справе выхавання падрастаючага пакалення. У плане далейшага развіцця мастацкай самадзейнасці работнікі ДК павінны надаць больш ўвагі ансамблю "Зараначка", у якім спяваюць менавіта мясцовыя школьнікі.

Старшыня выканкама Брылеўскага сельсавета Уладзімір Ільіч Мажораў абагульніў усё сказанае і ўказаў на тое, што работа мясцовага Дома культуры павінна як мага больш адпавядаць запатрабаванням часу.

Па абмеркаванаму пытанню была прынята адпаведная пастанова. Было таксама разгледжана арганізацыйнае пытанне: замест выбыўшага Аляксандра Іванавіча Васількова ў склад выканкама ўвайшла Ала Міхайлаўна Яцкова.

Св. інф.

"Дороже жизни

14 кастрычніка 2008 г. у Брылеўскай школе-сад адбылося свята, прымеркаванае да Дня маці. Настаўніца Тамара Трафімаўна Жураўкова павіншавала прысутных са святам і расказала, якое значэнне для кожнага з нас мае мама. А потым вучні распачалі карагод вяселля, гульняў і святочнага настрою.

Гледачы з цікавасцю назіралі за перыпетыямі тэатралізаваных сцэнак. Затым усе разам адказвалі на пытанні, якія задавала Т.Т.Жураўкова. З хваляваннем слухалі вершы пра маму, якія чыталі і вучні школы, і выхаванцы дзіцячага сада. Давалі парады камандам, якія спаборнічалі за найлепшае выкарыстанне прапанаваных харчовых прадуктаў. З жартамі ўспрымалі памкненні тых, хто з завязанымі вачыма навобмацак разбіраўся, дзе якая крупа знаходзіцца. І, вядома ж, актыўна "хварэлі" за удзельнікаў рознастайных гульняў. Потым былі падарункі для матуль, зробленыя сваімі рукамі. А над усім гэтым святочна лунаў вялікі ліст паперы з назвай *"Пусть всегда будет мама!"*, дзе кожны з вучняў паставіў адбітак сваёй далоні і напісаў самыя чулыя словы для мамы.

І здалося, што прахалодны кастрычніцкі дзень значна пацяплеў ад гэтага свята.

Т.Т.Жураўкова

Ала ЯЦКОВА,
бібліятэкар Брылеўскай бібліятэкі.

Ой, як цікава!..

Адбіткі далоняў і пажаданні любімым матулям

Карына Бірукова, Кірыл Куляшоў і Яна Какоўка

Юлія і Мікіта Ермалаевы


Цімафей Баброў

Рэгіна Жукава

Андрэй Жукаў

Мікіта Жукаў

Ганна Ермалаева

Зміцер Мяшкоў

"только мама..."

К.М.Жукава, А.І.Мухортава і Г.М.Мяшкова

Што ж можна зрабіць з гэтых прадуктаў?..

Хто хутчэй?

Балельшчыкі



"А гэта якая крупа?"

"Пыласос"

А.М.Яцкова і Н.А.Ярмаш

Л.П.Карнеева і Т.М.Васюрэнка

Падарункі мамачкам

Кастусь і Марына

Аляксей Аляксейкоў

Дар'я Старс

Раман Макарэвіч

Карына Паршнёва

Фінальная песня

...І па восені - вяселле!

Як гэта бывае на Беларусі спрадвеку, восеньскай парой, калі на палетках заціхае адвечная праца, пачынаюцца вяселлі. Не абышла гэта традыцыя і нашу Марыну Міхайлаўну Маісеенка, якая 4 кастрычніка 2008 г. ва ўрачыстай абстаноўцы Залатой залі магілёўскага Палаца абрала шлюб з Юрыем Сяргеевічам Атрошчанка. І шырока развінулася свята, і шматлікія госці ад усяго сэрца павіншавалі маладых, пажадаўшы ім доўгай і светлай дарогі ў сямейную будучыню. І мы далучаемся да гэтых пажаданняў. Шчасця вам, Марына і Юрый!

З бацькамі

Фотаздымкі з сямейнага архіва Марыны і Юрыя АТРОШЧАНКА

З братам Дзянісам і нямецкімі сябрамі -- Эрыхам і Андрэ Тэнспольдэ



Брылеўская бібліятэка інфармуе...

Белорусская НИВА

Традыцыйны "Беларускі рушнік" прапануе чытачам верш Леаніда ГЛУШКО:

Матулі.

Дазволь мне сесці побач, мама!
Даўно з табою не сядзеў.
Такіх было хвілін у нас мала:
Я быў у працы кожны дзень.
Не выпадала мо нам часу,
Каб пасядзець, пагаманіць
І пра жыццё, і долю нашу.
І як мы будзем далей жыць.
Часцей давай мы сустракацца,
Пакуль жывецца на зямлі...
Спачатку -- мама, потым -- праца,
Каб толькі дужымі былі.
Шчэ пасядзім даўжэй з табою,
І нават песню прапяём
З матуляй самай дарагою,
З якой у ростанях жывём...
Дазволь мне сесці побач,
Мама!

№ 9, 2008 г.

Вядомы беларускі пісьменнік Іван КАРЭНДА ў роздумах пра жыццё:

...Самае лепшае ў чалавека -- тое, чым ён можа ганарыцца. Гэта -- вяршыня, на якую яму ўдалося ўзняцца. Вяршыня чалавечай годнасці.

... Вакол каго аб'ядноўваецца народ? Калі верыць палітыкам,- вакол іх. Ваенныя сцвярджаюць, што аб'яднаць народ, асабліва ў катастрафічныя дні, могуць толькі яны. Насамрэч, народ аб'ядноўваюць дзеячы культуры -- чароўная дырыжорская палачка яднання людзей знаходзіцца ў іх руках.

Іван Карэнда

... Толькі адзінота гарантуе чалавеку поўную незалежнасць. Свабода кожнага з нас заканчваецца тады, калі мы ўступаем у стасункі з іншымі людзьмі і ў той ці іншай ступені залежым ад іх.

...Брытанскі кнігавыдавец С.Вестуотэр пра рускія народныя казкі выказаўся так: "Мараль гэтых твораў мяне вельмі здзівіла. Героі рускіх казак нічога не робяць для вырашэння сваіх праблем. Фізічна здаровыя Іваны-царэвічы сядзяць у чаканні, што ім дапаможа Канёк-Гарбунок, Васіліса Прамудрая, Шэры Воўк, Залатая Рыбка. За аказаную дапамогу яны ніколі нікому не дзякуюць. І чамусьці ледзь не ўсе рускія казкі заканчваюцца крадзяжом."

...Самы аптымістычны прагноз, які мне давялося пачуць за сваё жыццё ад прарокаў: "Камунізм -- светлая будучыня ўсяго чалавецтва". А самы дакладны, -- ад маіх аднавяскоўцаў: "Нешта будзе".

Народный доктор

№ 20, 2008 г.

У человека есть не только физическая оболочка, но и астральная, ментальная и другие. Все вместе они составляют ауру, или каркас. Не каждый знает, почему мы порой остаёмся здоровыми и невредимыми, даже если нас хорошенько продует или сильно промокнут ноги. А другой раз чуть повеет ветерок -- и уже насморк, кашель.

Всё дело в том, что у каждого человека ежемесячно происходит смена биологического каркаса. И в среднем 1-2 дня каждый из нас находится без ауры, «голый».

У тех, кто родился с 22 сентября по 21 марта любого года, смена биологического каркаса происходит с 5 по 11 число каждого месяца. А у тех, кто родился с 21 марта по 22 сентября -- с 18 по 23. Будучи «голым», человек подвергается различным опасностям. В этот период рекомендуется вести себя более сдержанно, уходить от конфликтов, по возможности не общаться со злыми людьми, беречься от простуды, осторожнее обращаться с огнём и режущими предметами, быть более внимательным за рулём автомобиля.



У 10-м нумары часопіса "Вожык" надрукавана новая песня паэта Казіміра Камейшы і кампазітара Міколы Яцкова "Сёмае неба".

МОГИЛЕВСКАЯ ПРАВДА

17.10.2008 г.

Американские учёные обнаружили, что пользование Интернетом улучшает деятельность мозга, по меньшей мере у людей среднего и пожилого возраста. Также считается, что ежедневные упражнения, требующие концентрации памяти и внимания, например, чтение или разгадывание кроссвордов, могут замедлить процесс снижения мозговой активности у ветеранов, а также, возможно, снизить риск развития старческого слабоумия.

Прозвішча падпісчыка

На беразе возера Нарач

Больш за два гады -- з сакавіка 2006 па май 2008 -- у Беларусі сярод школьнікаў праводзіўся конкурс “Жыву ў Беларусі -- і тым ганаруся”. Адным з пераможцаў гэтага спаборніцтва стала наша Юлія Ярмаш, якая вызначылася ў пашуковай рабоце школьнага клуба “Следопыт” пад кіраўніцтвам настаўніцы Валянціны Іванаўны Пацёмкінай. У якасці ўзнагароды Юля паехала ў самы лепшы беларускі лагер “Зубронак”, які раскінуўся на беразе возера Нарач. Адпачынак быў аб’яднаны з вучобай, рознымі цікавымі мерапрыемствамі і змястоўнымі экскурсіямі па навакольных мясцінах. Юля з сябрамі пабывала ў вёсцы Мосар, якая за сваю прыгажосць атрымала назву “Беларускі Версаль”. У горадзе Глыбокае спадабаліся храмы. Таксама “зубраняты” ездзілі ў Хатынь і старажытны Полацк.

І, па словах Юлі, яна вельмі б хацела зноў пабываць у непаўторнай краіне, якая мае такую цудоўную назву -- “Зубронак”.

Мікола ЯЦКОЎ.

Фотаздымкі з асабістага архіва Ю.Ярмаш.



Заслужаная ўзнагарода

Возера Нарач

Жылыя карпусы

Прыём у “зубраняты”

Помнік Папе Яну Паўлу II у в. Мосар і касцёл у в. Нарач

Новыя сябры



Святочны канцэрт

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 299 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© “Брылеўскі летапіс”, 2008

Заснавальнік і рэдактар
Мікола ЯЦКОЎ